БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 9 кастрычніка 1997 года, чацвер, № 12 (1767)

Свята на нашай вуліцы

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Перашкурснікі яшчэ не адаптаваліся да студэнцкага жыцця. Трэцякурснікі ўжо задумваюцца, дзе б знайсці грошы, каб не быць у фінансавай залежнасці ад бацькоў. Пяцікурснікі хвалююцца перад уваходам у дарослае жыццё...

Усе іх праблемы дапамогуць разблытаць у сацыяльна-педагагічным цэнтры універсітэта. Багдай, "бедных" студэнтаў у нас і не застанецца

Стар. 2

Тым, хто цікавіцца новымі камп'ютэрнымі тэхналогіямі, прапануем заканчэнне серыі артыкулаў пра Інтэрнэт

Стар. 3

Унутрыуніверсітэцкае жыццё на дзесятым годзе Савецкай улады ў першым універсітэце рэспублікі ўсё яшчэ насіла характэрныя рысы нядаўняй рэвалюцыйнай эпохі. Па калідорах хадзілі хлопцы і дзяўчаты, якія прыйшлі ва універсітэт ад "станка і сахі". Гэтым хлопцам і дзяўчатам у абавязковым парадку выдзяляліся не толькі стыпендыі, але і месца ў інтэрнаце...

Стар. 4

Навасёлы

1 кастрычніка родныя сцены і ўласны дах над галавой атрымаў, нарэшце, факультэт міжнародных адносін нашага універсітэта.

Кожная краіна толькі тады чаго-небудзь вартая, калі ў дадатак да дэкларованай незалежнасці выхавае ўласны дыпламатычны корпус. Толькі тады яна ўвойдзе ў сусветную супольнасць раўнапраўным партнёрам сярод суседзяў. А для таго, каб будучыя прадстаўнікі Беларусі ў замежжы адчувалі сябе больш упэўнена, няблага было б, каб вопыт сталых выкладчыкаў тыя, хто яшчэ толькі вучыцца на дыпламатаў, пераймалі ва ўтульных аўдыторыях. Першыя два гады свайго існавання факультэт міжнародных адносін такой магчымасці не меў. Пакутавалі ад гэтага і выкладчыкі, і студэнты, і, па вялікім рахунку, уся беларуская дыпламатыя. На пачатку гэтага навучальнага года блуканне па будынках нарэшце скончылася. Надзеі пяцісот навучэнцаў і выкладчыцкага саставу спраўдзіліся.

Сапраўднае свята на прыступках уласнага дома не сапсавала нават журботнае надвор'е. Дождж падчас ганаровага адкрыцця адноўленага будынку па вуліцы Скарыны, 25 успрымаўся прысутнымі як прыкмета таго, што факультэт будзе багатым на таленавітых выпускнікоў усё сваё доўгае жыццё.

Ніколі яшчэ вышэйшыя прадстаўнікі іншых дзяржаваў не наведвалі якую-небудзь беларускую навучальную ўстанову ўсе разам. У гэты ж дзень на прыступках сабраліся для віншавання будучых калег паслы Італіі, Кітая, Польшчы, часовы павераны Францыі, прадстаўнікі пасольстваў Латвіі, Літвы, Украіны, Амерыкі, Вялікабрытаніі, Індыі, Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў.

— Мы сапраўды доўга чакалі гэтага свята,— адзначыў дэкан факультэта Аляксандр Віктаравіч Шарапа. А кіраўнік будаўнічай арганізацыі дадаў, што маглі б чакаць і яшчэ больш. Справа ў тым, што тэрмін у шаснаццаць месяцаў, адведзеных нарматывамі на аднаўленне і перапраектаванне, будаўнікам удалося скараціць да дзесяці. Як паведаміў прысутным рэктар БДУ Аляксандр Уладзіслававіч Казулін, пераўтварэнне будынка ва ўтульную навучальны корпус каштавала 1 мільён долараў.

Цяпер адзінаццаць паверхаў гэтага высотнага будынка (карысная плошча каля дзвюх з паловай тысячаў квадратных метраў) не толькі месца працы для выкладчыкаў, але ў першую чаргу, як адзначыў рэктар, уласны дом для тых, хто ў хуткім часе будзе праводзіць міжнародную палітыку Беларусі.

Як высветлілася, будаўнікі, якія рыхтавалі гэты падарунак для факультэта, вельмі падобныя да студэнтаў. Яны працавалі да самай апошняй хвіліны і, як гэта водзіцца падчас сесіі, усю апошнюю ноч перад галоўным экзаменам — здачай будынка новым гаспадарам. Падчас цырымоніі перараззання стужкі і перадачы сімвалічнага ключа ад памяшкання яны сталі ў натоўпе студэнтаў і, бачна было, хваляваліся.

Заняткі ў новым корпусе пачаліся 2 кастрычніка.

З навасяллем!

Госці

Кангрэс у БДУ

Еўразійская студэнцкая асацыяцыя (ЕСА) была створаная на пачатку 1994 года па ініцыятыве кіраўніцтва Студэнцкага савета МДУ. Яе асноўныя мэты былі вызначаны як прадстаўленне інтарэсаў навучэнскай моладзі універсітэтаў краінаў Садружнасці, спрыянне фармаванню еўразійскай адукацыйнай прасторы, развіцця маладзёжных кантактаў. За тры гады Асацыяцыя папоўнілася новымі членамі, сфармаваліся яе пастаянныя праграмы. Цяпер праводзяцца рэгулярныя сустрэчы універсітэцкага студэнцтва краінаў СНД, наладзіліся сяброўскія адносіны. Плённае супрацоўніцтва ў ЕСА і з Белдзяржуніверсітэтам, у прыватнасці, з упраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю, Студэнцкім саюзам, камітэтам БПСМ.

Цяпер заканчваецца падрыхтоўчая праца да чарговага, трэцяга Кангрэсу Еўразійскай студэнцкай асацыяцыі, рыхтуюцца матэрыялы, абмяркоўваецца парадак працы, прапановы па кадравых пытаннях. Кангрэс будзе праходзіць 15-17 кастрычніка на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта адначасова з міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыяй "Праблемы навукова-даследчай работы студэнтаў".

Аляксандр ЛАБКОЎ

Афіцыйны аддзел

Вучыся лепей — заплаціш меней

24 верасня прарэктар Белдзяржуніверсітэта па эканоміцы і камерцыйных пытаннях Сяргей Аляксандравіч Векша сустрэўся з прадстаўнікамі маладзёжных арганізацыяў Белдзяржуніверсітэта. Асноўнае пытанне сустрэчы — нядаўняе павышэнне кошту адукацыі для студэнтаў-платнікаў III-VI курсаў. Цяпер у залежнасці ад катэгорыі, да якой адносіцца факультэт, студэнты, што паступалі па выніках субяседавання павінны плаціць 1200 долараў у год на прыродазнаўчых спецыяльнасцях, 1500 — на гуманітарных і 2000 на факультэце міжнародных адносін і правазнаўстве. Для тых, хто здаваў іспыты і проста не прайшоў па конкурсу, вышэйазначаныя сумы памяншаюцца напалову. А калі студэнт меў да таго ж і паўпрахадны бал, то заплоціць яшчэ удвая меней.

Як патлумачыў Сяргей Аляксандравіч, раней грошы, якія паступалі ў БДУ ад студэнтаў платнай формы навучання III-VI курсаў, пакрывалі толькі частку рэальных выдаткаў. Так, у 1996 годзе студэнты аплочвалі 57% ад рэальнага кошту іх навучання, а ўжо ў 1997 — толькі 29%. Таму адміністрацыя універсітэта была вымушаная павялічыць плату за навучанне, але і цяпер студэнты III-VI курсаў будуць плаціць на 25-30% меней, чым іх калегі на малодшых курсах.

Рэктарат пакуль што не будзе прымяняць строгія меры да студэнтаў, якія не паспелі сабраць неабходную суму для працягу навучання. Магчымы шлях для такіх студэнтаў — заключыць новую дамову зараз, а грошы заплаціць да пачатку наступнага семестра. Таму ў студэнтаў-кантрактнікаў старэйшых курсаў яшчэ ёсць час, каб сабраць неабходную суму.

Адміністрацыя факультэтаў будзе індывідуальна падыходзіць да фінансавых магчымасцяў студэнтаў, зважаючы на іх стаўленне да навучання. Права на скідку ужо цяпер атрымалі многія платнікі, якія маюць на гэта асабістыя падставы і абавязкова маюць толькі станоўчыя адзнакі. Так што ў дадзеным выпадку кошт навучання зніжаецца ў залежнасці ад глыбіні ведаў.

Уладзімір МАЗУРЫН

Выключна для маладых

Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў абвяшчае конкурс на суісканне грантаў для маладых навукоўцаў "Навука — 97М".

На конкурс прадстаўляюцца праекты фундаментальных і пошукавых даследаванняў, якія маюць вялікае навуковае ці практычнае значэнне, з тэрмінам выканання да 2 гадоў.

Суіскальнікамі грантаў могуць быць асобныя маладыя навукоўцы або групы даследчыкаў (да 3 чалавек) — навуковыя работнікі, спецыялісты, аспіранты, студэнты вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь ва ўзросце да 33 гадоў.

Заяўкі на конкурс, афармленыя ва ўстаноўленым парадку, прымаюцца да 14 лістапада 1997 года ўключна ў выканаўчай дырэкцыі Фонду на адрас: 220072, г.Мінск, пр.Ф.Скарыны, 66, пакой 414.

Тэл. для даведак: 268-57-22. 268-48-90, факс 239-31-62.

Стаць "лішнім" магчыма

З 1 кастрычніка пачаліся экзамены для тых, хто жадае трапіць у аспірантуру. Сярод тых, хто пажадаў стацыянарна набыць вышэйшую навуковую адукацыю, у гэтым навучальным годзе, на жаль, абавязкова знойдуцца "лішнія людзі". Як ні спрабуй, на 110 месцаў не размесціш 147 прэтэндэнтаў ды яшчэ 25 магістраў. Дарэчы, некаторыя з апошніх, хто на "выдатна" вытрымаў усе іспыты і абараніў магістарскую дысертацыю, залічваюцца ў аспірантуру без экзаменаў. Нельга адназначна сцвярджаць, у каго цяга да ведаў большая — фізікаў ці лірыкаў. За 10 месцаў па спецыяльнасці "Фізіка" будуць змагацца 18 чалавек, за 15 месцаў на філфаку — 24 чалавекі, на планавае 1 месца на кафедры педагогікі хацелі б трапіць 3 прэтэндэнты. Але з'ява гэта ўсё ж пазітыўная. Таму што ў выніку ў навуку прыйдуць лепшыя з лепшых. Пакуль што невядома, хто стане "лішнім". Гэта вызначыцца за месяц сур'ёзнай праверкі ведаў усіх прэтэндэнтаў. Часцей за ўсё, выдатна вытрымаўшы экзамен па спецыяльнасці, яны "правальваюцца" на агульнаадукацыйных дысцыплінах: філасофіі і замежнай мове.

А вось сярод завочнікаў, наадварот, недобар. Магчыма, таму, што нядаўна распрацаванае замест былога саюзнага рэспубліканскае палажэнне аб падрыхтоўцы кадраў вышэйшай навуковай адукацыі істотна памяншае ільготы для тых, хто пажадаў адукоўвацца без адрыву ад вытворчасці. Цяпер яны не маюць права на дадатковы адпачынак і адзін "дысертацыйны" дзень у тыдзень з 50-працэнтнай аплатай. Падчас гэтага набору знайшлося ўсяго 38 ахвотнікаў праседжваць у бібліятэцы па выхадных і вечарах.

З 15 кастрычніка пачнецца прыём дакументаў ад суіскальнікаў. Можна меркаваць, што, як і ў мінулыя гады, іх будзе шмат — каля 120 чалавек, прычым, тыя, хто не працуе ў сістэме народнай адукацыі, павінны будуць аплочваць сваё навучанне.

Зінаіда МАРАВА

Навыперадкі з часам

На цяперашні момант кожны разумны чалавек ужо дакладна ўсвядоміў, што, перажыўшы ў XX стагоддзі каласальны скачок у навуковым і тэхнічным развіцці, чалавецтва пераходзіць у XXI стагоддзе з найвастрэйшай патрэбай асэнсаваць усё, што адбылося. 80-90 гадоў — тэрмін нават па жыццёвых мерках не вельмі вялікі, і людзі наўрад ці могуць моцна змяніцца за такі дробны прамежак часу. А між тым аб'ём элементарных ведаў, неабходных сучаснаму чалавеку для паўнацэннага існавання, проста нельга параўнаць з аналагічнай колькасцю інфармацыі, што лічылася нармальнай, скажам, у 1910 годзе. Таму цяперашнія маладыя людзі (ці, спадзяюся, прынамсі, пераважная іх большасць) у першыя два дзесяткі гадоў свайго існавання вымушаныя прымаць такую колькасць звестак, якая для іх пагодкаў на пачатку нашага стагоддзя цалкам стасавалася б як салідны жыццёвы досвед.

Кепскага ў гэтым, вядома, нічога няма. І інтэлектуальных здольнасцяў нармальнага чалавека, без сумневу, хопіць і на неабходныя веды, і на шмат чаго іншага. Засмучае, аднак, тое, што нягледзячы на штогадовае ўзрастанне аб'ёму інфармацыі выкладанне яе ў нашых навучальных установах застаецца, па вялікім рахунку, на тым самым узроўні, што і 30, і 50 гадоў таму. Выкладчыкі ВНУ і сталыя спецыялісты адзначаюць, што студэнцкія гады — час найбольш напружанай працы ў жыцці чалавека з вышэйшай адукацыяй. Сярэднія школы, не спраўляючыся з падрыхтоўкай моладзі, стаяць на парозе дванаццацігадовага навучання, і, здаецца, гэта яшчэ не мяжа.

Спрачацца, увогуле, ніхто не будзе — у методыцы выкладання трэба нешта мяняць, але чамусьці толькі вельмі невялікая частка зацікаўленых у гэтым людзей здольная ўсвядоміць, што шлях, па якому трэба ісці, існуе. Больш за тое, ён эфектыўна і ўсебакова выкарыстоўваецца ва ўсіх развітых краінах свету. І шлях гэты — выкарыстанне ў навучальным працэсе сучасных інфармацыйных тэхналогіяў. Шырокараспаўсюджаныя ў свеце і даступныя ў нашай дзяржаве магутныя найноўшыя сістэмы камп'ютэрнай алгебры (няхай нікога не палохае слова "алгебра" — дасведчаныя людзі зразумеюць, пра што ідзе гаворка) дазваляюць пры належным іх выкарыстанні практычна неадкладна ўзняць нашую сярэднюю і, галоўным чынам, вышэйшую адукацыю на якасна новы ўзровень — узровень, на якім ужо знаходзяцца ўсе вядучыя універсітэты свету.

Студэнт, які засвоіць першыя навыкі працы з камп'ютэрам і элементарныя асновы праграмавання, неабходныя сёння спецыялісту кожнай накіраванасці, атрымае магчымасць перакласці на плечы машыны працаёмістыя матэматычныя пераўтварэнні, зможа мадэляваць і рашаць задачы па фізіцы, эканоміцы, хіміі, біялогіі і г.д.

Знаёмая ўсім студэнтам сцэна, калі лектар, спісаўшы ўсю дошку выкладкамі, разбірае просценькі выпадак выкарыстання якой-небудзь асаблівай значнай тэарэмы, а потым абвяшчае, што па аналогіі можна разабраць і больш складаныя варыянты, ды толькі ўручную гэта немагчыма і таму ў праграму прадмета не ўваходзіць,— гэтая сцэна ўжо мусіць адысці ў мінуўшчыну і толькі перадавацца вусна, як анекдоты. Што застаецца ў галаве студэнта ад такой лекцыі да канца навучання — усім вядома. А калі б формулу з той самай тэарэмы прадаставіць камп'ютэру і з яго дапамогай парашаць дзесятак-два задачаў, не адцягваючы ўвагу на рутынныя падлікі,— і практычнага досведу было б болей, і курс стаў бы глыбейшым і паўнейшым.

Матэматыкі ўсяго свету заўжды будуць схіляць галаву перад найбольшым навукоўцам XVIII стагоддзя Леанарда Эйлерам, які зрабіў болей, чым падавалася магчымым у ягоныя часы, і згубіў зрок за выпісваннем бясконцых пераўтварэнняў і інтэгралаў. Але сёння студэнты XX-XXI стагоддзяў не могуць дзейнічаць на тым самым узроўні, вывучаючы класічныя вынікі.

Аднак нягледзячы на відавочныя перавагі і, я б нават сказаў, жыццёвую неабходнасць найхутчэйшага засваення новых камп'ютэрных сродкаў гэты працэс сустракае велізарную колькасць перашкодаў, многія з якіх самі па сабе бліжэйшым часам наўрад ці знікнуць. Сярод іх не апошняе месца займае тая акалічнасць, што многія выкладчыкі матэматычных дысцыплінаў (не кажучы ўжо пра астатніх) самі не маюць дастатковых практычных навыкаў працы з камп'ютэрамі і таму дагэтуль ставяцца да іх з пэўнай перасцярогай і недаверам. Некаторыя студэнты зараз значна лепей і больш вольна



працуюць з вылічальнай машынай, чым іхныя настаўнікі, і гэта стала ўжо звычайнай з'явай. Мне самому даводзілася быць сведкам таго, як, напрыклад, на механіка-матэматычным факультэце трэцякурснікі хвацка рашалі індывідуальныя заданні па выкарыстанню лікавых метадаў, праводзячы грувасткія вылічэнні і правяраючы прамежкавыя вынікі з дапамогай нескладаных у выкарыстанні сістэмаў Derive або Mathcad, выклікаючы гэтым самым у выкладчыка змяшанае пачуццё разгубленасці і захаплення.

Але гэта было "даўно" — гады тры таму. І камп'ютэрная матэматычная індустрыя ўжо сышла далёка наперад, чаго нельга сказаць пра нашую адукацыю. Цяпер студэнты самастойна засвойваюць такія магутныя пакеты, як Maple і Mathematica, прычым версія 3.0 апошняй прызнаная ў свеце найбольш значным дасягненнем у галіне стварэння універсальных сістэмаў камп'ютэрнай алгебры. Менавіта Mathematica 3.0 з'яўляецца сёння вельмі дзейснай "падтрымкай" у навучанні студэнтам 50 вядучых універсітэтаў свету. Гэтым пакетам карыстаюцца (вядома ж, у развітых краінах) прадстаўнікі многіх прафесіяў — ад хімікаў і біёлагаў да сацыёлагаў і адвакатаў.

Канешне, пакуль што ніякая камп'ютэрная праграма не здолее самастойна даць чалавеку веды кваліфікаванага спецыяліста, але дапамагчы ў вывучэнні асобных пытанняў — ужо рэальна. І дапамога, якую можа аказаць Mathematica 3.0, даволі істотная. Апрача вялікай колькасці ўбудаваных элементарных і спецыяльных матэматычных функцыяў, магутнай графікі, якая дазваляе ствараць двух- і трохмерныя графікі і адлюстраванні паверхняў у самых разнастайных выглядах і сістэмах кааардынатаў, Mathematica валодае яшчэ і ўбудаванай мовай праграмавання, якая па сінтаксісу нагадвае Сі, пры дапамозе якога карыстальнік сам можа ствараць неабходныя яму канструкцыі, выкарыстоўваючы магчымасці пакета. Менавіта гэтая асаблівасць праграмы прывяла да таго, што ў розных краінах з'яўляюцца спецыялізаваныя дадаткі "пад Mathematica", якія ахопліваюць практычна ўсе сферы сучаснай навукі. І, відавочна, такая ўласцівасць пакета ўяўляе шырокае поле для дзейнасці як студэнтаў, так і прафесіяналаў.

Можа быць, калі-небудзь мы яшчэ падыдзем да праблемы павелічэння часу для атрымання адукацыі, але наўрад ці мае сэнс рабіць гэта зараз, не выкарыстаўшы ўсе наяўныя эфектыўныя сродкі. "Век жыві, век вучыся" — мудрасць гэтага выслоўя не аспрэчыш, але, згадзіцеся, неразумна вучыцца самім і навучаць уласных дзяцей усё больш ўзрастаючым дасягненням навукі, выкарыстоўваючы пры гэтым дзедаўскія метады, ужо свядома адкінутыя іншымі. Гэтак сама неразумна, як крычаць праз акіян, забыўшыся на тэлефон, або спрабаваць пешшу абагнаць авіялайнер. Час імкліва бяжыць наперад і ставіць перад намі пэўныя (і вельмі жорсткія) патрабаванні. Не адстаць бы!

Сяргей ЗЯМСКОЎ,
група сістэмаў камп'ютэрнай алгебры і аналізу ЦІТ БДУ

Што новага?

У "бедных" студэнтаў не будзе праблем

У новым навучальным годзе распачынае сваю працу сацыяльна-псіхалагічны цэнтр студэнцкага гарадка БДУ. Стварэнне такога цэнтра меркавалася ўжо даўно, бо студэнты, якія жывуць у інтэрнатах, у большай ступені патрабуюць псіхалагічнай і сацыяльнай падтрымкі, чым мінчане.

Спецыялісты цэнтра распрацавалі перспектыўны план работы, які ўключае асобныя планы для першага, другога-чацвёртага і пятага курсаў. Такі падзел неабходны, паколькі праблемы студэнтаў другога-чацвёртага курсаў у многім прыпадабняюцца, а першы і пяты курс маюць свае асаблівасці.

Першакурснікі яшчэ не адаптаваліся ў студэнцкім асяроддзі, не засвоілі ў поўнай меры правілаў сумеснага жыцця, не выявілі сябе ў грамадскім жыцці. Яны хутчэй стамляюцца на занятках, больш востра перажываюць першую сесію. Працэс адаптацыі працягваецца паўгода, а часам і болей. Праблемы ўзнікаюць штодзённа — і сацыяльныя, і псіхалагічныя.

Пяты курс — выпускны: усе сур'ёзна распланоўваюць сваё будучае жыццё, многія студэнты да гэтага часу ўжо працуюць, некаторыя маюць сем'і.

Каб аказаць дапамогу сацыяльна няўдачлівым студэнтам, на пачатку навучальнага года цэнтр мяркуе правесці сацыялагічнае апытанне на ўсіх курсах з мэтай выяўлення тых, чыё матэрыяльнае становішча ніжэй за сярэдняе, інвалідаў, тых, хто вырас у шматдзетных сем'ях. У працы з першакурснікамі плануецца аказанне дапамогі ў фармаванні міжасобасных стасункаў, выяўленні індывідуальна-тыпалагічных уласцівасцяў асобы, дыягностыка адаптацыі да навучальнага працэсу.

На падставе аналізу звестак псіхалагічнага дыягнаставання і сацыялагічных апытанняў спецыялісты цэнтра мяркуюць стварыць базу псіхолага-педагагічных характарыстыкаў. Яна дапаможа сацыяльным педагогам ў выхаваўчай рабоце, дазволіць карэктаваць выхаваўчы працэс, улічваць псіхалагічныя асаблівасці студэнтаў.

Сацыяльна-псіхалагічны цэнтр будзе аказваць дапамогу педагогам у інтэрнатах ў прафілактыцы супрацьпраўных дзеянняў з боку студэнтаў, выяўляць студэнтаў з асацыяльнымі паводзінамі, праводзіць з імі індывідуальную працу.

Вялікая ўвага ў рабочым плане сацыяльна-псіхалагічнага цэнтра надаецца пытанням прафесійнага самавызначэння. Прадугледжваюцца дыягностыка асаблівасцяў спецыялізацыі ў працэсе прафарыентацыі, аналіз прафесійнай прыдатнасці. Для пятага курса плануецца дыягностыка падрыхтаванасці да выбранай прафесіі, сацыялагічнае апытанне пра жыццёвыя планы пасля заканчэння навучання.

Цэнтр зоймецца праблемай занятасці студэнтаў. Мяркуецца распрацоўка праграмаў міжнароднага супрацоўніцтва з моладдзю замежных краінаў.

Прадугледжваецца індывідуальнае кансультаванне па асабістых праблемах, па міжасобасных стасунках, па пытаннях сям'і і шлюбу.

Сацыяльна-псіхалагічны цэнтр заўжды адчынены для студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах. Адрас цэнтра: вул.Кастрычніцкая, 4, кабінет 103.

Наталля ДАНІЛАВА,
псіхолаг сацыяльна-псіхалагічнага цэнтра студэнцкага гарадка

Ініцыятыва

Новае пакаленне выбірае

У лістападзе 1997 года ў Маскве адбудзецца І Кангрэс маладзёжных арганізацыяў СНД — "Новая маладзёжная прастора".

"Новая маладзёжная прастора" — гэта подых нашага часу. Ініцыятарам яго правядзення выступіла міжнародная Асацыяцыя маладзёжных ініцыятываў (AMI).

Для чаго патрэбны саюз маладзёжных арганізацыяў СНД? Гэта не адраджэнне УЛКСМ, які распаўся ў 1992 годзе. Ягоная задача — навесці масты супрацоўніцтва паміж маладзёжнымі арганізацыямі. Нам, грамадзянам Садружнасці, лёгка зносіцца і разумець праблемы адзін аднаго, раіцца і абменьвацца досведам. А на цяперашнім этапе ў кожнай асобна ўзятай рэспубліцы значна больш кантактаў з маладзёжнымі арганізацыямі і рухамі заходнееўрапейскіх краінаў, чым з арганізацыямі СНД. Не варта выназодзіць ровар у чалавечых зносінах і формах супрацоўніцтва, але і ўвесь час прымерваць заходнюю вопратку (своеасаблівыя Second hands) таксама не пасуе. Няхітрая справа трапіць у гатовы след, больш цяжка і ганарова пракладваць шлях самому.

Добры пачатак, як вядома,— палова справы. А пачатак ёсць. Ужо прынятая канцэпцыя І Кангрэса і тэзісы платформы "Маладзёжная прастора".

Новаму пакаленню, за якім будучыня, не ўласцівая настальгія па СССР. Сённяшняя моладзь практычна не памятае адзінай дзяржавы. Самастойныя палітыка-прававыя інстытуты, атрыбуты паўнацэннай дзяржаўнасці сталі звыклымі для ўсіх краінаў былога СССР і сур'ёзна ўспрымаюцца маладымі людзьмі.

Асноўная мэта Кангрэса "Новая маладзёжная прастора" — наладжванне супрацоўніцтва і зносінаў маладзёжных арганізацыяў СНД, што адказвала б памкненням новых пакаленняў, якія ўступаюць у самастойнае жыццё.

Дэлегацыі, якія прымуць удзел у працы Кангрэса, сфармуюцца нацыянальнымі падрыхтоўчымі камітэтамі, што будуць стварацца ў кожнай рэспубліцы.

Мяркуецца правесці ў рамках Кангрэса шэраг спецыяльных паседжанняў па наступных тэмах:

— СНД у XXI стагоддзі — сусветная правінцыя або новы цэнтр уплыву? Эканамічныя рычагі СНД; Садружнасць як умова стабілізацыі і развіцця нацыянальных эканомік. Новыя магчымасці для развіцця бізнесу ў рамках СНД;

— Адзіная культурная і гуманітарная прастора СНД: пустая ідэалагема ці жыццёвая неабходнасць? Суіснаванне культураў і рэлігіяў на прасторы Садружнасці;

— Маладзёжныя і дзіцячыя арганізацыі краінаў СНД і новая маладзёжная прастора. Значэнне СНД для новага пакалення;

— Супрацоўніцтва маладых прадстаўнікоў усіх галінаў улады краінаў СНД як адзін з фактараў стабільнасці і развіцця Садружнасці ў доўгатэрміновай перспектыве;

— Маладыя суайчыннікі: нацыянальныя дыяспары ў краінах СНД. Новы ўзровень узаемадзеяння нацыяў, уласцівы прадстаўнікам сённяшніх і заўтрашніх пакаленняў.

У рамках працы Кангрэса мяркуецца правесці прэзентацыю праграмаў маладзёжных арганізацыяў, выставу праектаў, абмен досведам працы, а таксама арганізаваць ініцыятыўныя паседжанні рабочых групаў па распрацоўцы агульных праектаў.

Навізна маладзёжнай прасторы на тэрыторыі краінаў СНД — у развіцці ўнутраных элементаў маладзёжнай палітыкі для кожнай краіны і іх знешнім узаемадзеянні. Кожны з складнікаў маладзёжнай прасторы можа развівацца сам па сабе і аказваць уплыў на астатнія. Яе адзінства мусіць выражацца не ў стварэнні адзінай арганізацыі, а ва ўзаемадзеянні маладзёжных структураў унутры СНД.

Гэтая прастора зможа стымуляваць інтэграцыйныя працэсы ў межах СНД, а таксама аказваць уплыў на дзяржаўныя структуры краінаў Садружнасці.

Дыяна БАЛЫКА,
студэнтка гістфака

Што такое Інтэрнэт

Мы заканчваем знаёміць нашых чытачоў з камп'ютэрнай сеткай Інтэрнэт і прапануем наступны артыкул з серыі матэрыялаў, прысвечаных тым, хто збіраецца працаваць у гэтай галіне.

VII. Пошук і прыём інфармацыі ў рэжыме Search

28. Як коратка ахарактарызаваць сутнасць працы ў рэжыме Search?

Існуюць два спосабы здабывання камп'ютэрызаванай інфармацыі: *Browse* і *Search*.

Web-старонкі, як і старонкі звычайнай кнігі, можна гартаць (*browse*) — г.зн., паслядоўна пераходзіць ад аднаго дакумента да другога па сістэме гіперсувязяў або задаючы іх адрасы (*URL*). Методыка працы ў рэжыме *Browse* абмяркоўвалася ў папярэднім артыкуле пра Інтэрнэт.

Search — гэта мэтанакіраваны пошук Web-дакументаў па пэўных іх прыкметах, часцей за ўсё па наяўнасці (ці адсутнасці) у дакументах нейкага слова (ці набора словаў).

Сам браўзар для такой працы не прызначаны. Ён толькі можа злучыць чытача са спецыяльнымі пошукавымі праграмамі (*search and retrieval software*; *search tool*; *search engine*), якія дзейнічаюць у межах адной ці некалькіх электронных баз дадзеных.

29. З якіх структурных элементаў складаецца электронная база дадзеных?

Асноўным структурным элементам электроннай базы дадзеных з'яўляецца запіс (*record*). Напрыклад, ва ўжо знаёмым нам масіве *ESToC* ("Змест часопісаў выдавецтва *Elsevier Science*") кожны з запісаў утрымлівае ў сабе звесткі толькі аб адным навуковым артыкуле.

Запіс, у сваю чаргу, падзяляецца на шэраг палёў (*fields*). Што да бібліяграфічных баз дадзеных, то найчасцей па асобных палях размяркоўваюцца наступныя порцыі інфармацыі: прозвішчы аўтараў, назва артыкула, назва часопіса, год выдання, рэферат.

Такая структураванасць дазваляе эфектыўна вырашаць даволі разнастайныя праблемы, напрыклад: "Знайсці запісы, у якіх сустракаецца слова *XXX*", "Знайсці запісы, у якіх слова *XXX* сустракаецца толькі ў назве артыкула", "Знайсці публікацыі аўтара *YYY*", "Знайсці публікацыі аўтара *YYY*, выдадзеныя ў часопісе *ZZZ* у *NNN* годзе" і г.д.

Зразумела, што (1) для пошуку неабходна ведаць *URL* сэрвера, на якім знаходзіцца патрэбная база дадзеных; (2) на гэтым сэрверы павінен быць не толькі інфармацыйны масіў, але і свая пошукавая праграма.

30. Якія прыкметы паказваюць на тое, што з базай дадзеных можна працаваць у рэжыме Search?

Знешнім атрыбутам пошукавай праграмы з'яўляецца **пошукавы бланк**, які мае па меншай меры два элементы: месца (*поле*) для запісу **пошукавай фразы** і кнопку *Search* (варыянты: *Seek*, *Find* і г.д.).

Электронныя базы дадзеных, арыентаваныя толькі (ці ў асноўным) на рэжым *Search*, звычайна ўтрымліваюць пошукавы бланк на сваёй Галоўнай старонцы. У іншых выпадках для пераходу ў рэжым *Search* (канешне, калі ён дазваляецца) трэба скарыстацца яшчэ адной, навігацыйнай, кнопкай *Search* або гіперсувяззю з словам *search* (напрыклад, Search the database...).

Праілюструем сказанае на прыкладзе базы дадзеных *ESToC*.

У верхняй частцы Галоўнай старонкі *ESToC* (*http://www.elsevier.nl/estoc/*) знаходзяцца навігацыйныя кнопкі; трэцяя ў шэрагу мае назву ***Search*** і прызначаецца для пераходу ў аднайменны рэжым працы.

Калі націснуць на навігацыйную кнопку ***Search***, на экран выводзіцца пошукавы бланк. *ESToC* можа прапанаваць бланкі трох ступеняў складанасці; найбольш просты з іх (*Basic*) прыведзены на малюнку 1.



Мал. 1

31. Якія дзеянні трэба выканаць, каб пачаць працэс пошуку?

Пачынаючы пошук, трэба запоўніць пошукавы бланк: (1) вызначыць крытэрыі, па якіх павінен адбывацца адбор інфармацыі — запісаць пошукавую фразу (гл. ніжэй); (2) калі на бланку ёсць іншыя палі з пераменнымі параметрамі, адпаведным чынам запоўніць іх; (3) даць загад праграме пачаць пошук — націснуць кнопку ***Search***.



Мал. 2

32. Як фармулюецца пошукавая фраза і якія асаблівасці могуць мець пошукавыя праграмы ?

У найбольш простым выпадку пошукавая фраза можа складацца з аднаго слова. Вынікам дзейнасці пошукавай праграмы па такому заданню быў бы выбар з базы дадзеных і вывад на экран усіх запісаў, у якіх сустракаецца гэтае слова.

Асноўнай перавагай камп'ютэрызаванай апрацоўкі інфармацыі з'яўляецца магчымасць хуткага адбору матэрыялу адразу па некалькіх параметрах, таму на практыцы часцей карыстаюцца мнагаслоўнымі пошукавымі фразамі — гэта значна павялічвае эфектыўнасць працы. Вось толькі правілы складання такіх фразаў могуць адрознівацца ў розных базах дадзеных — адзінага стандарту для пошукавых праграм у свеце няма. Што тут можна парэкамендаваць — не лянуйцеся чытаць анлайнавую дапаможную дакументацыю (гл., напрыклад, гіперсувязь Quick Reference на мал.1). Мы ж цяпер коратка ахарактарызуем некаторыя дэталі, на якія трэба звяртаць асаблівую ўвагу.

Пакуль што большая частка пошукавых праграм арыентуецца на заданні, сфармуляваныя з дапамогай аператараў алгебраічнай логікі (***Boolean search***). Стандартны мінімум аператараў, якія адназначна ўспрымаюцца ўсімі такімі праграмамі — гэта *AND*, *OR* і *NOT*. Прывядзем прыклады іх выкарыстання ў пошукавых фразах:

aaa AND bbb — знайсці запісы, у якіх ёсць і слова *aaa*, і слова *bbb*;

aaa OR bbb — знайсці запісы, у якіх ёсць або слова *aaa*, або слова *bbb*;

aaa NOT bbb — знайсці запісы, у якіх ёсць слова *aaa*, але няма слова *bbb*.

Іншыя аператары дазваляюць пабудаваць больш рафінаванае заданне, але трэба мець на ўвазе, што іх сэнс можа вар'іравацца ў розных базах дадзеных. У прыватнасці, для пошуку ў *ESToC* выкарыстоўваюцца: *ADJ* (аб'яднаныя аператарам тэрміны павінны быць у непасрэдным суседстве і менавіта ў такім жа парадку); *W/n* (тэрміны павінны быць у межах *n* слоў адзін ад аднаго і менавіта ў такім жа парадку; *NEAR/n* (тэрміны павінны быць у межах *n* слоў адзін ад аднаго і ў любым парадку).

Апошнім часам у многіх базах дадзеных пошукавую фразу прапануецца запісваць ўвогуле без аператараў. Перш чым рабіць гэта, разбярыцеся, як праграма інтэрпрэтуе такі тэкст. Справа ў тым, што замест прапушчаных аператараў адныя сістэмы аўтаматычна падстаўляюць *AND*, другія — *ADJ*, а трэція — *OR*. Тут хаваецца вялікая верагоднасць непаразумення паміж чытачом і аўтарам праграмы.

Розныя спосабы існуюць для таго, каб пошукавую фразу для многавар'янтнага задання зрабіць кампактнай:

1) Функцыя скарачэння (***truncation***) замяняе частку слова ўмоўным сімвалам (звычайна, зорачкай *). Гэта дазваляе аб'ядноўваць аднакарэнныя словы ў адну групу, але вынікі могуць быць і непажаданымі. Напрыклад, *chlor** азначае і блізкія *chlorine*, *chloride*, *chlorate*, і далёкі па сэнсу, затое сугучны *chlorophyll*.

2) Даволі распаўсюджаныя праграмы, якія ў т.зв. рэжыме *stemming* аўтаматычна ўлічваюць існаванне розных граматычных формаў (слова *run* адпавядае групе *run*, *runs*, *running* і г.д.).

3) Шаблон (***wildcard***) замяняе пераменную літару ў сярэдзіне слова (напрыклад, *analy?e* — тое ж, што *analyze* і *analyse*).

Па-рознаму задаецца тып поля, у якім плануецца праводзіць пошук. Адныя праграмы патрабуюць, каб адпаведныя ўказальнікі былі ўключаныя ў сам тэкст пошукавай фразы. Іншыя прапануюць для гэтага спецыяльны пошукавы бланк з наборам уключальнікаў і/ці меню. На мал.2 прыведзены прыклад такога бланка з заданнем "Знайсці артыкулы аб фасфатах цырконію, апублікаваныя ў 1996 годзе аўтарам *Clearfield'ам*" (*ESToC*, *Combined Search*).

Што датычыць прынцыпаў выбару матэрыялу з базы дадзеных, то тут таксама ёсць два падыходы: (1) строгае падпарадкоўванне інструкцыі, закладзенай у пошукавай фразе; (2) трактоўка пошукавай фразы як пажадання, а не загаду. Праграмы апошняга тыпу колькасна па многіх параметрах ацэньваюць адпаведнасць (***relevancy***) знойдзенай інфармацыі заданню, і чытачу перадаецца пакет запісаў, адсартаваных ад больш адпаведнага да менш адпаведнага.

Вышэй адзначалася, што пошукавая фраза з аператарамі — не адзіны магчымы спосаб фармулявання задання. Альтэрнатыўны метад, для якога дастаткова тэкста, запісанага на натуральнай мове, — ***free-text search*** — усё часцей выкарыстоўваецца ў WWW. У многіх базах дадзеных чытач сам можа выбіраць рэжым пошуку — *Boolean search* ці *free-text search*.

33. Ці ёсць якія-небудзь асаблівасці ў методыцы захоўвання інфармацыі, атрыманай у рэжыме Search?

Незалежна ад рэжыму працы для захоўвання інфармацыі выкарыстоўваецца адна і тая ж методыка (падрабязнасці — у мінулым артыкуле пра Інтэрнэт).

Мне давялося сутыкнуцца толькі з адной асаблівасцю — падчас запісу на дыск файлаў з расшырэннем *.cgi* захоўваецца толькі пошукавы бланк, а знойдзеная інфармацыя можа згубіцца. У такіх выпадках трэба скапіраваць тэкст у кліпбард, перанесці яго ў тэкставы рэдактар і запісваць у фармаце *.txt*.

34. Як можна знайсці URL дакумента патрэбнай тэматыкі?

Web-прастора пастаянна сканіруецца спецыяльнымі робатамі, і ў выніку ствараюцца базы дадзеных — каталогі Web-старонак. Калі далучыцца да такой базы дадзеных, то з дапамогай адпаведнага пошукавага сродку (*search engine*) можна атрымаць *URL* і нават гіперсувязь да патрэбнага дакумента. Вядома больш дзесятка вялікіх каталогаў; кожны мае свае плюсы і мінусы, звязаныя з аб'ёмам, тэматыкай, глыбінёй індэксавання і г.д. На першым этапе працы мне здаецца мэтазгодным азнаямленне з двума пошукавымі сродкамі: *Yahoo!* і *Infoseek*.

Yahoo! (*http://www.yahoo.com*): 200 тыс. запісаў, размешчаных па тэматычных каталогах і падкаталогах. Падтрымліваюцца рэжымы *Browse* і *Search*. У гэтай базе дадзеных прываблівающь кароткія (двух-, трохрадковыя), але інфарматыўныя анатацыі да Web-дакументаў.

Infoseek (*http://www.infoseek.com*): 50 млн. запісаў. Рэжым *Browse* падтрымліваецца, але асноўныя вартасці базы дадзеных сканцэнтраваныя ў выдатнай пошукавай праграме, якая працуе ў рэжымах *Boolean search* і *free-text search*.

Дэтальны разгляд методыкі працы з *search engines* — тэма асобнай размовы; агульная ж схема пошуку выглядае наступным чынам:

1) Вызваць Web-старонку з пошукавым бланкам (напрыклад, *http://www.yahoo.com*).

2) У пошукавым полі запісаць набор тэрмінаў, якія, на вашу думку, абавязкова павінны быць у патрэбным Web-дакуменце (асабліва у яго загалоўку). Націснуць кнопку *Search* (ці *Find*, ці *Seek*).

3) На экран выводзіцца спіс — *URL* і першыя радкі з тых дакументаў, якія ў большай ступені адпавядаюць вашаму заданню. Выбраць патрэбны дакумент і шчоўкнуць па гіперсувязі — *тэксту URL*. Камп'ютар злучыць вас з патрэбнай Web-старонкай.

Поспехаў ВАМ у пошукавай працы!

А. РАГОЙША
Сорасаўскі вучэбна-інфармацыйны цэнтр па хімічнай адукацыі
Кафедра агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі

Чорны пояс Аляксандра Таляронка

Аляксандр ТАЛЯРОНАК, студэнт III курса юрыдычнага факультэта. Займаецца каратэ. Неаднаразова ўдзельнічаў у чэмпіянаце Беларусі, міжнародных спаборніцтвах, уладальнік "чорнага пояса", майстар спорту.

— Саша, што заахвоціла цябе займацца каратэ?

— Спачатку, у 13 гадоў, я прыйшоў у секцыю рукапашнага бою. На занятках не толькі "адпрацоўвалі" блокі і ўдары, але і займаліся гімнастыкай, акрабатыкай, рухомымі гульнямі. Зараз я разумею, што заняткі ў секцыі былі "на выжыванне". Секцыя "зляпіла" мяне ў адно цэлае, выпрацавала неабходныя якасці для заняткаў каратэ.

У 1993 годзе нашая сям'я вярнулася ў Мінск. Я вырашыў пайсці ў секцыю Беларускай Федэрацыі традыцыйнага каратэ-до. Ахвотных займацца ў вядучага трэнера Беларусі Пятра Калініна было вельмі многа. Таму адбор быў самым суровым. Мяне "апрабоўвалі" многія спецыялісты. А галоўны іспыт здаваў Пятру Міхайлавічу.

— І як, паспяхова?

— Я пачаў займацца ў асноўнай групе ў трэнера Калініна.

— Саша, заняткі спортам, частыя паездкі не ўплываюць на вучобу адмоўна?

— Навучацца на юрыдычным факультэце складана. Але заняткі ў секцыі мяне навучылі цаніць час, да хвіліны планаваць усе справы. Пакуль што каратэ ў навучанні не замінае.

— Ты займаешся каратэ больш за тры гады. Калі не сакрэт, чаго ты дасягнуў?

— Увесну 1994 года я ўдзельнічаў у чэмпіянаце РБ (9-е месца), у снежні заняў 3-е месца на Кубку РБ. У 1995 і 1996 гадах — І-е месца на чэмпіянаце РБ і міжнародных спаборніцтвах у Кішынёве. Здаў на "чорны пояс".

— Табе даводзілася прымяняць прыёмы каратэ на практыцы?

— Каратэ навучае не толькі прыёмам бою, але і гуманным прынцыпам. Скажам, не нападаць першым. У экстрэмальнай сітуацыі магу пастаяць за сябе ды іншых.

— Саша, што даюць табе заняткі каратэ?

— Яно дапамагае мне самасцвердзіцца ў жыцці.

Размаўляў
Анатоль КОНАНАЎ,
дацэнт

Што ж там адкапалі?

Нават малая практыка вартая вялікай тэорыі. А калі практыка з маленькай перарасла ў археалагічную, гэта значыць, што вы скончылі першы курс гістфака БДУ. Наўрад ці яшчэ на якім факультэце свята пасвячэння ў студэнты пакідае такія незабыўныя сляды ў душы і на... целе.

На гістарычным факультэце яно доўжыцца 21 дзень. На тры ліпеньскія тыдні студэнты-гісторыкі на берагах Браслаўскіх азёраў ператвараюцца ў археолагаў. Яны не толькі раскапваюць старажытныя курганы, гарадзішчы і селішчы, але і праходзяць сур'ёзную школу выжывання.

Шмат складанасцяў узнікае (асабліва першым часам) у "асфальтнага дзіцёнка", калі ён апынаецца без апекі клапатлівых бацькоў у лесе, поўным камароў, кляшчоў, рамантычных, але нязведаных сцяжынак, прывабных, але невыразных далячыняў, крыштальных, але глыбокіх азёраў.

Цяжка жыць у палатцы, варыць ежу на вогнішчы для васьмідзесяці чалавек і не мець мажлівасці прыняць двойчы на дзень душ. Тут няма даравання капрызам, ляноце і дэпрэсіі, але вельмі цэніцца пачуццё гумару, працалюбства і вынаходлівасць.

Працоўны дзень маладога археолага пачынаецца а шостай раніцы страшным словам "Пад'ём!". Пасля сняданку з пераваранных макаронаў, дзе тушонка сустракаецца гэтак жа рэдка, як і індывідуальная археалагічная знаходка (напрыклад, бронзавы наканечнік стралы), — ранішні мацыён (4 км) да раскопа. З 8 да 14 гадзінаў адбываецца менавіта тое, дзеля чаго вырвалі цяплічныя расліны з звыклага асфальтавага асяроддзя і кінулі на выжыванне ў браслаўскія лясы. Хлопцы арудуюць рыдлёўкамі: кідаюць у насілкі найкаштоўнейшы для археалогіі культурны слой,— а дзяўчаты пераціраюць у руках усе камячкі зямлі ў надзеі знайсці што-небудзь цікавае, каб зрабіць рэвалюцыю ў археалогіі або... атрымаць адгул.

Дотронуться своей рукой до прошлого.
Историю черпать, но не из книг.
Обратный бег часов — и невозможное
Подвластно археологу на миг.
И в летний зной, и в день дождливый, ветренный
Пласт за пластом, как дверь в уснувший мир,
Он открывает бережно: доверено
Не растревожить песен старых лир.

А жизнь его походами означена:
Поклоны предкам бьёт своим челом.
И, на пути повенчанный с Удачею,
Предстанет перед древним очагом.

И каждый камень очага усталого,
Как мудрый старец, долго говорит.
И археологу легенды старые
Поведает крошащийся гранит.

Романтика не каждому открытая,
Не всем доступна музыка костей.
От посторонних глаз надёжно скрытая
История рождений и смертей.

А пасля працы пад высокім небам, дзе міргацяць зоркі, ля вогнішча плачуць і смяюцца тоненькія гітарныя струны — моладзь спявае. Спяваюць усё, пачынаючы з "Прекрасного далёко" і сканчваючы "Мама — анархия, папа — стакан портвейна".

И рвётся шёлк во тьму искрою к звёздам.
А тёплый воздух единеньем создан.
Задумчивые песни у костра,
И память до безумия остра.

А под руками дышит звук гитары.
Мотив живой и оттого не старый.
На перекрёстке грустно-нежных глаз
Я неизменно вспоминаю вас.

У гэтай практыцы шмат паходнай рамантыкі заплечнікаў, яна пахне вогнішчам і лесам. Гэта рамантыка абветраных вуснаў. Абветраных таму, што часта закусваеш іх, калі баліць, але нельга паказаць слабасць і выпусціць слязінку. Абветраных ад песень і слоўных баталіяў. ад пацалункаў на ветры.

Адшукалі мы не вельмі шмат. Нашыя знаходкі папоўнілі фонды гістфака, і, магчыма, калі будзе мяняцца экспазіцыя музея, яны дойдуць да шырокага гледача.

Дыяна БАЛЫКА, студэнтка беларускамоўнага аддзялення гістфака

Чырвонаармейцы ў адпачынку

Семдзесят гадоў таму — на пачатку першага семестра 1927 года — пабачыў свет першы ў гісторыі вышэйшай школы савецкай Беларусі студэнцкі часопіс "Шлях студэнцтва". Для больш чым трохтысячнага маладзёжнага калектыву БДУ выхад агульнаўніверсітэцкага часопіса быў далёка не шараговай падзеяй: ва ўсёй перыёдыцы рэспублікі тады налічвалася наўрад ці больш за тры дзесяткі рэспубліканскіх і акруговых газетаў.

Дзякуючы масавым выданням тых гадоў і самому зжаўцеламу ад часу студэнцкаму часопісу, які стаў цяпер музейным экспанатам, бібліяграфічнай рэдкасцю, да нашых дзён дайшлі надзвычай цікавыя факты студэнцкага жыцця, вельмі не падобнага да сучаснага,— цяжкога і разам з тым цудоўнага часу ў гісторыі беларускага студэнцтва, чыя маладосць супала з маладосцю рэспублікі. Менавіта гэтыя факты, якія сталі ўжо набыткам гісторыі, і ўяўляюць для нас сёння найбольшую цікавасць.

Сучасны Мінск папросту немагчыма ўявіць сабе без галоўнага корпуса БДУ на плошчы Незалежнасці, комплексу будынкаў універсітэцкага гарадка. Але ў далёкім 1927 годзе універсітэт, які існаваў ужо шэсць гадоў, яшчэ не меў аніводнага спецыяльна пабудаванага для яго памяшкання, а размяшчаўся ў чатырнаццаці мала прыстасаваных для заняткаў будынках, раскіданых па гораду. Цесната, неўпарадкаванасць суправаджалі студэнтаў не толькі ў навучальных карпусах, але і ў інтэрнаце. Ва ўрадзе, наркамаце адукацыі рэспублікі, якая толькі акрыяла ад наступстваў жахлівай разрухі часоў грамадзянскай вайны, добра разумелі неабходнасць карэнных пераўтварэнняў у сферы вышэйшай школы. Менавіта таму ў тым самым годзе быў урачыста заложаны першы аўдыторны корпус БДУ. За некалькі гадоў меркавалася пабудаваць па суседству з чыгуначным вакзалам 8 навучальных карпусоў, 2 жылыя дамы для выкладчыкаў, шэраг надворных пабудоваў, гараж, пральню і нават лазню.

Унутрыуніверсітэцкае жыццё на дзесятым годзе Савецкай улады ў першым універсітэце рэспублікі ўсё яшчэ насіла характэрныя рысы нядаўняй рэвалюцыйнай эпохі. Гэта адлюстроўвалася нават на такой празаічнай справе, як размеркаванне стыпендыяў. Дарэчы, сённяшні студэнт-выдатнік застаўся б у тыя гады без 19-рублёвай стыпендыі. бо высокая паспяховасць папросту не была важкой прычынай для яе атрымання.

Найбольшыя шанцы на назначэнне стыпендыі былі ў рабфакаўцаў. На рабочым факультэце займаліся чатыры сотні маладых людзей, якія прыйшлі ў ВНУ "ад станка і сахі". Гэтым хлопцам і дзяўчатам у абавязковым парадку выдзяляліся не толькі стыпендыі, але і месцы ў інтэрнаце. На астатніх амаль 2700 студэнтаў спецыяльная камісія размяркоўвала ўсяго 1050 стыпендыяў. Запаветную суму ў 19 рублёў атрымлівалі штомесячна палітычныя эмігранты, а таксама тыя, хто меў "асаблівыя заслугі перад рэвалюцыяй". Рэальна на стыпендыю маглі прэтэндаваць былыя выхаванцы дзіцячых дамоў, былыя вайскоўцы Чырвонай Арміі, актывісты савецкіх і прафсаюзных арганізацыяў. Ну, а выхадцы з сем'яў службоўцаў і інтэлігенцыі, напрыклад, пры размеркаванні стыпендыяў мелі самыя мінімальныя шанцы.

Паміж тым, матэрыяльнае становішча студэнтаў расцэньвалася кіраўніцтвам ВНУ як "вельмі цяжкое". Маладыя людзі, якія паступілі ў БДУ, рызыкавалі сур'ёзна падарваць сваё здароўе за час навучання. Пасля трох-чатырох гадоў напружанай вучобы ў сярэднім па дзесяць гадзінаў на суткі прыкладна 63% юнакоў і дзяўчат пакутавалі на малакроўе, неўрозы, хварэлі на сухоты і іншыя хваробы. Пры ўсім гэтым абавязковая зараз на працягу чатырох гадоў навучання фізкультура ў БДУ 20-х гадоў была доляй нешматлікіх аматараў і прадметам клопатаў студэнцкага савета. З дапамогай фізічнай культуры, якой захапляліся не болей за 6% універсітэцкіх студэнтаў, паправіць здароўе большасці выхаванцаў найстарэйшай ВНУ рэспублікі, відавочна, не ўяўлялася магчымым. Цяжкое становішча са станам здароўя студэнтаў часткова кампенсавалася тым, што за універсітэцкія грошы 35-40 чалавек штогод маглі паехаць у Крым ці на Каўказ для санаторна-курортнага лячэння.

Заняткі ва універсітэце праводзіліся ў крыху іншыя тэрміны, чым цяпер. На малодшых курсах навучальны год пачынаўся ў канцы верасня, а на старэйшых — першага кастрычніка. Зімовыя канікулы працягваліся цэлы месяц — з 1 студзеня па 1 лютага. Значна адрозніваўся ад цяперашняга і падыход да навучання вайсковай справе, курс якой называўся "вышэйшай дапрызыўнай падрыхтоўкай". Вайсковай справай у БДУ займаліся пагалоўна ўсе студэнты, пасля таго як у 1927 годзе яна стала абавязковай і для дзяўчат. Курс вайсковых мастацтваў уключаў у сябе рэгулярныя заняткі ва універсітэцкім агульнавайсковым кабінеце, наведванне стралковага ціра, экскурсіі ў Дом Чырвонай Арміі і аб'яднаную вайсковую школу, дзе студэнцтва знаёмілася з усімі відамі "аружжа". Студэнт БДУ, паводле выразу журналістаў таго часу, быў "як бы чырвонаармейцам у адпачынку". Застаецца толькі здзіўляцца, як пры такой унушальнай колькасці хворых студэнтаў перад універсітэцкім стралковым цірам не знікалі доўгія чэргі ахвотнікаў пастраляць па мішэнях.

Перыяд 1927-1928 гадоў, калі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце выходзіў часопіс "Шлях студэнцтва", у многім быў паваротным у жыцці галоўнай вышэйшай навучальнай установы рэспублікі. У той час у сістэмы вышэйшай адукацыі, якая імкліва развівалася, нібыта адкрылася другое дыханне. Будаваліся навучальныя карпусы, рабіліся сур'ёзныя крокі па паляпшэнню студэнцкага побыту і арганізацыі навучальнага працэсу. Менавіта ў 1927/1928 навучальным годзе ў БДУ ўпершыню з'явіліся факультэцкія прыёмныя камісіі, пачалася праца па стварэнню пры універсітэце навуковага выдавецтва. У той далёкі час, яшчэ не азмрочаны беспадстаўнымі рэпрэсіямі значных прадстаўнікоў беларускай навукі і культуры, у рэспубліцы шмат рабілася для ўмацоўвання і развіцця нацыянальнай вышэйшай школы.

Пётр ДАРАШЧОНАК,
кіраўнік
прэс-службы БДУ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета надрукавана на Мінскай паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.
Ум. друк. арк. 1
Падпісана ў друк у 12.00.

9 КАСТРЫЧНІКА
Зак. 1796
Т. 1000 экз.

Бясплатна

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР